

НОВАЯ ВАКЦЫНА ЯК ВЫНІК СУПРАЦОЎНІЦТВА
2

ГАСПАДАРЫ ПАКІНУТЫХ ВЁСАК
13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

29 ЛІПЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 147 (29769)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

*«Прыярытэтнай задачай для дэпутатаў Гродзенскай вобласці стане пошук новых формаў ва ўзаемадзеянні з насельніцтвам. Мы не будзем адмаўляцца і ад традыцыйных, напрацаваных за вялікі перыяд часу формаў. Але цяпер нам трэба навучыцца слухаць і чуць нашых выбаршчыкаў, разумець тыя праблемы, з якімі яны не могуць справіцца самастойна, і дапамагаць ім гэта рабіць. Важнай задачай на найбліжэйшыя паўтара года будзе падрыхтоўка да выбарчага этапу — выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, мясцовых Саветаў і членаў Савета Рэспублікі, якія пройдуць у адзін дзень у лютым 2024 года. Таксама важнай для абласнога Савета дэпутатаў стане работа з маладым пакаленнем. Сёння дзяржава дае шмат магчымасцяў для раскрыцця і самарэалізацыі кожнага маладога чалавека. Але часта не ўсе пра гэта ведаюць. Праекты будуць накіраваны на тое, каб маладыя людзі маглі сябе рэалізаваць тут і працаваць на карысць нашай дзяржавы».*

# Усё ідзе як па рапсе



У сельгаспрадпрыемстве «ЖодзінаАграПлемЭліта» Смалявіцкага раёна пад азімыя і яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры адведзены палеткі плошчай у 3500 гектараў. Некалькі дзён таму ў гаспадарцы пачалося жніво. Механізаваны атрад з дзевяці камбайнаў, нягледзячы на няўстойлівае надвор'е, паспеў змалаціць 165 гектараў азімага ячменю і атрымаць ураджайнасць з кожнага гектара сорак пяць цэнтнераў. Учора да прыцемкаў хлебаробы ўвіхаліся на рапсавых палетках, якіх у гаспадарцы восемсот гектараў, імі змалочана больш за 150 гектараў алейнай расліны.

Уладзімір СМОЛЬСКІ *(на фота)* — высакакласны спецыяліст і перадавы механізатар гэтага прадпрыемства, знаны ў раёне працаўнік, больш як трыццаць гадоў з добрым настроем удзельнічае ў жніве. Дарэчы, палеткі, на якіх яно ідзе, наш герой яшчэ і засяваў — і як толькі скончыцца ўборка, зноў перасядзе на трактар і пачне весці азімую сяўбу: пад ураджай наступнага года. Але гэта яшчэ наперадзе, а цяпер са сваімі калегамі-камбайнерамі брыгадзір Уладзімір Смольскі гектар за гектарам збірае сёлетні ўраджай.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Па палічках

## СТРОГА ПА ГРАФІКУ

### Як энергетыка і сістэма ЖКГ рыхтуюцца да зімы

**Бадай, кожны гараджанін нашай краіны штогод сутыкаецца з праблемай, як перажыць адключэнне гарачай вады. Але такія адключэнні — не проста капрыз камунальнікаў, гэта пытанне працаздольнасці Мінжылкамгаса сумесна з арганізацыямі Міністэрства энергетыкі. Каб якасць нашага жыцця ў халады, якія надыдуць, была на дастаткова высокім узроўні, многім ведамствам трэба дбайна падрыхтавацца летам...**

**70 % — у ліпені. Паказчык нармальны**

Як заявіла **намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі — начальнік аддзела энергетыкі надзвычайных сітуацый Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Святлана ЦІМОШКІНА,** узровень выканання падрыхтоўчых работ да ацяпляльнага сезона ў іх ведамстве ўжо складае каля 70 %. «Яшчэ ў красавіку 2022 года была падрыхтавана рабочая праграма па выкананні асноўных відаў работ падрыхтоўкі аб'ектаў ЖКГ да работы ў асенне-зімовы перыяд на 2022—2023 гады. У адпаведнасці з ёй мы і распачалі падрыхтоўку», — распавяла спецыяліст.

СТАР. 3

Жніво-2022

## ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ — НАДВОР'Е Ў ПОЛІ

**Аграрыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі плануюць атрымаць валавы збор збожжа ў бункернай вазе звыш мільёна тон. Ва ўсіх раёнах Гомельскай вобласці сёння ідзе ўборка збожжавых культур. У гаспадарках імкнуцца аператыўна і якасна ўбраць хлеб з палёў. Каб правесці жніво тэрмінова і пазбегнуць страт, аграрыі Гомельшчыны папоўнілі свой арсенал сотняй новых камбайнаў. Для абслугоўвання тэхнікі арганізавана звыш 20 выязных рамонтных брыгад. Карэспандэнт «Звязды» паназірала за ходам жніва ў Добрушскім раёне.**

СТАР. 4



КОРАТКА

- **Сёння ў Беларусі пройдзе Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху.**
- Рэспубліканская дабрачынная акцыя «У школу з добрым сэрцам», ініцыятарам правядзення якой з 2015 года выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, стартуе ў Беларусі 1 жніўня.
- **У крамах Віцебска з'явілася хлебабулачная прадукцыя з напамінамі ад МНС.**

ISSN 1990 — 763X

22147

9 771990 763008

З першых вуснаў

# «ПАСЛЯ ЎВЕДЗЕНЫХ САНКЦЫЙ ТРЭБА ГРУНТАВАЦЦА НА СВАІМ, ТРЭБА РАЗВІВАЦЬ СВАЁ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Пермскага краю Дзмітрыем Махоніным. Дэлегацыя рэгіёна знаходзіцца з трохдзённым візітам у нашай краіне.**

Вітаючы дэлегацыю Пермскага краю, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Расіі няма такіх рэгіёнаў, на якія Беларусі нельга было б абаперціся. «Ваш край, што тут казаць, багаты край і людзі вельмі таленавітыя, прасунутыя. І самае галоўнае — край перспектыўны, нацэлены ў будучыню. Вы заўсёды кажаце, што ваш край — апора Расіі. І я з гэтым абсалютна згодзен. Калі гэта апора вялізнай Расіі, то сам Бог загадаў нам супрацоўнічаць», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсё, што беларускі бок можа зрабіць для расіян, для людзей у Пермскім краі, будзе зроблена. «І нават немагчымае», — дадаў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што тавараабарот паміж Беларуссю і Пермскім краем крыху знізіўся. Па яго словах, неабходна прымаць меры, каб яго аднавіць.

«Мы павінны не проста прадэманстраваць усім, што мы абыдземся без тых, хто не хоча з намі працаваць. Мы павінны прадэманстраваць, што мы яшчэ можам нямала. Таму мы да вашых паслуг і па пастаўках, і па кааперацыі. Простым гандлем трэба займацца. Але найбольш надзейны варыянт, калі мы звязваем нашыя прадпрыемствы і працуем па кааперацыі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Як заўважыў Прэзідэнт, усім добра вядома, што беларусы захавалі сваю сельскую гаспадарку. Ён прапанаваў губернатару Пермскага краю пры неабходнасці падзяліцца адпаведным вопытам і напрацоўкамі, пачынаючы ад малочнатаварных комплексаў, адкормачнікаў, птушкафабрык. «Усё, што вам спадабаецца, мы гатовыя для вас рэалізаваць», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, калі беларусы змаглі працаваць з Амурскай вобласцю, то супрацоўнічаць з Пермскім краем зможам і пагатоў. Ён таксама звярнуў увагу дэлегацыі на сельгасмашынабудаванне. Прэзідэнт падкрэсліў, што беларускі бок гатовы паказаць не толькі сельгастэхніку, але і племянную, селекцыйную справу. У краіне ўсё гэта захавалі і не загубілі.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў супрацоўніцтве з Персмкім краем нямала зроблена і ў сферы будаўніцтва. І страціць тое нельга. «Пасля ўведзеных санкцый, трэба грунтавацца на сваім, трэба развіваць сваё, трэба займацца імпартазамяшчэннем ва ўсіх сферах. Давайце разам будзем гэта перададольваць, нейкія бар'еры. Прынамсі з прэзідэнтам Расіі ў нас ніякіх рознагалоссяў у гэтых адносінах няма», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што беларускія спецыялісты гатовыя дапамагчы Пермскаму краю ў правядзенні аграрных рэформаў, якія пачаліся ў рэгіёне, бо вопыт у гэтым ёсць. Таксама ішла гаворка пра супрацоўніцтва ў замене састарэлага ліфтавага абсталявання.

Прэзідэнт запэўніў Дзмітрыя Махоніна, што беларусі бок выканае ўсе дамоўленасці. Як бы ні было складана, усё будзе зроблена. «Давайце арыентавацца на тое, што тавараабарот у нас ні ў якім разе не павінен панізіцца. Мы людзі разумныя, знойдзем выйсце са становішча», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Каментарый у тэму

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам **губернатар Пермскага краю Дзмітрый МАХОНІН** сустрэўся з журналістамі і расказаў пра асноўныя напрамкі супрацоўніцтва. Ён прызнаўся, што яго продкі па маці з Беларусі, тут і сёння жывуць родзічы, таму асабіста для яго супрацоўніцтва з нашай краінай мае вялікае значэнне.

Дзмітрый Махонін расказаў, што 300 пермскіх прадпрыемстваў пастаўляюць сваю прадукцыю ў Беларусь. І 220 беларускіх прадпрыемстваў пастаўляюць сваю прадукцыю ў Пермскі край. «Гэтага недастаткова, відавочна. У нас ёсць перспектывы па машынабудаванні, вытворчасці абсталявання для калійных шахтаў. І цяпер ужо вытворчасць беларускай кампаніі «Ніва» размешчана ў Пермскім краі. І наша задача — стварыць сэрвісныя цэнтры, каб спрасціць працэдуру паставак і эксплуатацыі гэтага абсталявання. Па ліфтавым абсталяванні ў нас ёсць неабходнасць размяшчэння заказаў і, магчыма, лакалізацыя вытворчасці ў Пермскім краі. І зразумела, прадукцыя машынабудавання, сельскай гаспадаркі, сумесная работа нашых калійных прадпрыемстваў, пастаўка вугleвадародаў з Пермскага краю — увесь гэты спектр узаемаадносін дастаткова перспектыўны. Вельмі важна цяпер па лініі міністэрстваў і ведамстваў рэгіёна і рэспублікі замацаваць гэтыя дамоўленасці і далей іх рэалізоўваць» — расказаў Дзмітрый Махонін.

«Эканомікі Пермскага краю і Беларусі вельмі падобныя паміж сабой, 20 працэнтаў сусветнага калію ў Беларусі і 20 працэнтаў у Пермскім краі. Машынабудаванне — гэта таксама наша ключавая задача. У нас цесная кааперацыя ў абаронна-прамысловым комплексе. Нам трэба падумаць аб рэйсе паміж Перм'ю і Мінскам, і тады мы яшчэ раскрыем турыстычны патэнцыял», — упэўнены Дзмітрый Махонін.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Reuters: у ЗША ствараць трэцюю лідзіруючую партыю

**Новую палітычную партыю «Наперад» ствараюць экс-прадстаўнікі вядучых у ЗША Рэспубліканскай і Дэмакратычнай партый. Яна плануе вылучацца на выбарах у 2024 годзе. Пра гэта стала вядома Reuters.**

Прадпрымальнік і экс-кандыдат у прэзідэнты ад дэмакратаў Эндру Янг і былы губернатар штата Нью-Джэрсі рэспубліканец Крысцін Тод Уітман будуць старшынстваваць у новай партыі. На іх думку, «Наперад» зможа канкурыраваць з дамінуючымі дэмакратамі і рэспубліканцамі. Яны таксама лічаць, што Амерыку раздзірае палітычны экстрэмізм, і дзве ключавыя партыі — рэспубліканцы і дэмакраты — не змаглі знайсці выхаду з крызісу. «Калі нічога не зрабіць, то ЗША не дажывуць да свайго 300-га дня нараджэння. Таму мы і аб'ядноўваемся — каб пабудаваць новую партыю, што аб'яднае большасць амерыканцаў, якія хочуць пакінуць у мінулым раздробленасць і адкінуць экстрэмізм».

Лідары будучай партыі плануюць на восень 2022-га мерапрыемствы ў 20 гарадах ЗША. Як мяркуецца, летам 2023 года пройдзе першы з'езд. Цяпер у ЗША каля 40 нацыянальных партый. Апроч дзвюх вядучых партый, самымі прыкметнымі лічацца Партыя зялёных, Канстытуцыйная і Лібертарыянская партыі.

### Сталі вядомыя тэрміны візіту папы рымскага ў Расію

**Старшыня Сусветнага саюза старавераў (ССС) Леанід Севасцьянаў заявіў, што папа рымскі Францыск можа прыехаць у Расію пасля Адзінага дня галасавання ў верасні ці ў 2023 годзе, перадае РІА «Навіны».**



«Папа не ўступае ў перагаворы аб тым, калі ён павінен наведаць Расію — гэта перш за ўсё пытанне ўнутранай палітыкі. Візіт будзе, хутчэй за ўсё, на працягу 2023 года», — заявіў кіраўнік ССС.

Ён адзначыў, што папа рымскі хацеў бы наведаць Расію і паспрыяць перагаворнаму працэсу па сітуацыі ва Украіне. Пры гэтым ён падкрэсліве свой нейтралітэт у дадзеным пытанні, і хоць «усялякія колы спрабуюць паказаць, што ён палітызаваны, гэта зусім не так», адзначыў Севасцьянаў.

Раней папа рымскі Францыск выказаў меркаванне, што дзеянні НАТА каля граніц Расіі выклікалі рэакцыю Крамля ў адказ і паўплывалі на эскалацыю ўкраінскага крызісу.

### Global Times: ЗША паўтараюць ва Украіне памылку 20-гадовай даўнасці

**ЗША нічому не навучыліся ў Афганістане і цяпер паўтараюць ва Украіне сваю памылку, піша кітайскае выданне The Global Times.**

Аўтар піша, што Вашынгтон «улівае свае грошы» ва Украіну ў выглядзе зброі і эканамічнай дапамогі. Прычым для краіны, якая мае справу з рэкорднай інфляцыяй і дзярждоўгам, што выйшаў з-пад кантролю, сума ў памеры $40 мільярдаў, санкцыянаваная Кангрэсам у маі, — гэта значная сума, гаворыцца ў артыкуле. Аднак сітуацыя ва ўласнай краіне не лічыцца важнай для Белага дома, які паабяцаў падтрымліваць Украіну ўсім, «чым спатрэбіцца».

Стратэгія ЗША па ўзбраенні Украіны нагадвае сітуацыю ў Афганістане — «20-гадовую акупацыю, якая ганебна скончылася летась», піша журналіст.

«ЗША накіравалі войскі ў Афганістан у кастрычніку 2001 года, неўзабаве пасля тэрактаў 11 верасня. Тое, што павінна было стаць хуткай вайной адплаты, ператварылася ў 20-гадовую адкрытую рану на амерыканскім бюджэце», — гаворыцца ў артыкуле.

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 30 ліпеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Іванавіч КРУПКО. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Іван Іванавіч КУРМАН. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

# НОВАЯ ВАКЦЫНА ЯК ВЫНІК СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Дэлегацыя Кубы сустрэлася з беларускімі парламентарыямі

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў беларускія дэпутаты сустрэліся з дэлегацыяй Дзяржаўнага цэнтра па кантролі медыкаментаў, абсталявання і медыцынскіх прыбораў Рэспублікі Куба і інстытута вакцын «Фінлі» на чале з распрацоўшчыкам кубінскай вакцыны ад COVID-19, дэпутатам Нацыянальнай асамблеі народнай улады Кубы, Героем Рэспублікі Куба Вісэнтэ Гільерма БЕРЭС БЕНКОМА. Нагадаем, што 27 ліпеня ў Беларусі зарэгістравана кубінская вакцына супраць COVID-19 Soberana Plus. Бакі абмеркавалі яе прымяненне ў Беларусі, а таксама іншыя перспектывы супрацоўніцтва ў медыцынскай сферы.**

— Куба развівала свае вакцыны, і без гэтага нам было б складана змагацца з COVID-19. У нашага інстытута ёсць вопыт стварэння вакцын для дзяцей, таму нам было лёгка распаўсюдзіць на іх вакцыны супраць COVID-19. Мы першая краіна ў свеце, якая вакцынавала ўсіх дзяцей перад пачаткам школы. У нас сапраўды гэта прайшло паспяхова і хваля «Амікрона» была вельмі слабай, бо дзеці адыгрываюць важную ролю ў перадачы захворвання, — сказаў Вісэнтэ Гільерма Берэс Бенкома.

Кубінскі госць высока ацаніў узровень беларускай медыцыны.

— Учора мы былі ў цэнтры «Маці і дзіця». Тое, што я ўбачыў, мяне сапраўды вельмі моцна ўразіла, — адзначыў ён. — Я быў у Беларусі 11 гадоў таму. Я магу сказаць, што сапраўды відаць развіццё краіны за гэты час.

Дэпутат нагадаў, што Куба 60 гадоў знаходзіцца пад санкцыямі. Паводле яго думкі, нашы краіны, якія раздзяляюць вельмі многія рэчы, мусяць аб'яднацца, бо санкцыі падштурхоўваюць да больш цеснага супрацоўніцтва.

У прыватнасці, яно можа стаць больш цесным у абмене фармацэўтычнымі прадуктамі — так лічыць **дэпутат Нацыянальнай асамблеі народнай улады Кубы Юрый Вальдэс БАЛБІН.**

— Soberana — гэта суверэнная вакцына. Таму што мы, як і вы, сістэмна развіваем наш суверэнітэт. Прэзідэнт нас, вучоных, заклікаў развіваць сваю вакцыну, каб мы такім чынам абараняў свой суверэнітэт. І наш народ назваў першую вакцыну Soberana.

Дэпутат растлумачыў, што ёсць дзве вакцыны — Soberana і Soberana Plus. Другая спецыяльна распрацавана для дзяцей. Менавіта яна і зарэгістравана ў нашай краіне. Ёсць намер зарэгістраваць і першую.

— Кубінская вакцына на еўрапейскім кантыненце атрымала першую рэгістрацыю менавіта ў Беларусі. Гэта таксама вельмі сімвалічна і знакава для нашай далейшай сумеснай работы, — падкрэсліў **член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з Парламентам Кубы Сяргей КЛІШЭВІЧ.**

Ён расказаў, што супрацоўніцтва не абмяжоўваецца медыцынскай сферай і фармакалогіяй. Беларусь і Куба ўзаемадзейнічаюць у сферы сельскай гаспадаркі, турызму, прамысловасці.

— Актыўна працуем па ўсіх напрамках, абменьваемся ў тым ліку рабочымі групамі і дэлегацыямі, якія наведваюць Беларусь і Кубу. Для нас бачыцца важным выкарыстанне Кубы як нашага партнёра ў Лацінскай Амерыцы і маяка, праз які мы можам працаваць з іншымі краінамі Лацінскай Амерыкі. Па сутнасці мы пашыраем рынкі збыту нашай прадукцыі на іншыя лацінаамерыканскія дзяржавы, і кубінцы нам у гэтым дапамагаюць, — адзначыў парламентарый.

У свой час Беларусь гатовая быць для Кубы фарпостам у распаўсюджванні іх тавараў і паслуг не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і суседзяў, у першую чаргу краін ЕАЭС.

Зацікавіў кубінцаў і беларускі падыход да навукі.

— У гэтыя дні наведаем Нацыянальную акадэмію навук, дзе ёсць канкрэтныя праекты, па якіх мы будзем узаемадзейнічаць з беларускімі цэнтрамі. Нам вельмі падабаецца беларускі падыход да навукі. Гэта той падыход, які мы спрабуем сёння ўкараніць на Кубе. Плануем супрацоўніцтва паміж кубінцамі і беларусамі ў галіне навуковых праектаў і вытворчасці, — расказаў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кубы ў Беларусі Сант'яга ПЕРЭС БЕНІТЭС.**

Таксама падчас сустрэчы ў парламенце абмеркавалі пытанні ліцэнзавання беларускіх лекавых прэпаратаў на Кубе з магчымасцю іх рэалізацыі ў тым ліку на рынках краін Лацінскай Амерыкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Медыяпрастора

# У чым патэнцыял публіцыстычнага слова?

## Ён мацнее, калі газетныя артыкулы становяцца кнігамі

**У Мінску прайшоў круглы стол «Палітычная публіцыстыка ў медыйнай прасторы». Прадметам абмеркавання сталі нядаўна выдадзеныя кнігі палітычнай публіцыстыкі, аўтарамі якіх з'яўляюцца журналісты «СБ. Беларусь сегодня» Андрэй Мукавозчык, Мікалай Мачэкін, Людміла Гладкая, Юрый Церах, Алег Карповіч.**



Арганізатарам мерапрыемства выступіў Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» і грамадска-палітычны кансультатыўны савет Саюза пісьменнікаў Беларусі. Удзельнікамі сустрэчы сталі прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі, грамадскасці, сродкаў масавай інфармацыі, а таксама эксперты, дэпутаты і кіраўніцтва СПБ. Спікеры абмеркавалі шэраг пытанняў, у тым ліку папулярызацыю літаратуры сярод моладзі і ператварэнне публіцыстычных твораў у паўнавартаснае кніжнае выданне.

Падчас сустрэчы **Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік міністра інфармацыі,** адзначыў, што кніга — наймагутнейшая зброя:

— «Што такое добра і што такое дрэнна» — гэтая фраза здабыла ў апошні час, на жаль, актуальнасць. Але смеласць і прафесіяналізм людзей, якія напісалі такія кнігі, дазваляе казаць, што ў нас з'явілася палітычная публіцыстыка. І ў нас ёсць будучыня. Трэба, каб было імкненне змагацца не супраць чагосьці, а за нешта. Нам неабходна цяпер фармуляваць думкі, якія павінны ісці далей: за што мы і куды мы ідзём», — падкрэсліў Ігар Бузоўскі.

Дата правядзення круглага стала была абрана невыпадкова — у хуткім часе адбудзецца 95-гадовы юбілей газеты «Советская Белоруссия». **Кіраўнік выдавецкага дома «Беларусь сегодня», галоўны рэдактар газеты «СБ. Беларусь сегодня» Дзмітрый ЖУК** звярнуў увагу на каштоўнасць кнігі ў інфармацыйнай прасторы:

— Калі газетная публіцыстыка кладзецца ў кнігу, яна набывае зусім іншае гучанне. Газеты жывуць нядоўга, кнігі ж застануцца, і гэта самае галоўнае. Так, ёсць інтэрнэт, але пакуль для мяне самай вядомай і надзейнай крыніцай інфармацыі застаецца кніга.

Падчас мерапрыемства **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што палітычная публіцыстыка валодае вялікім патэнцыялам:

— Нараўне з драматычнымі падзеямі, з выкрыццём антыгерояў абавязкова павінны быць кнігі пра нашых герояў, нашых светачаў. І гэта мы бачым цяпер у сучаснай палітычнай публіцыстыцы, у гэтым яе сіла — і дзяржаўная важнасць.

У сваю чаргу, **Мікалай ЧАРГІНЕЦ, народны пісьменнік Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі,** звярнуў увагу на тое, што нельга забываць аб маладым пакаленні — трэба прывіваць ім любоў да літаратуры, папулярызаваць кнігу. Таксама пісьменнік выступіў з прапановай адрадзіць выданне сатырычнага часопіса «Вожык»:

— Гляджу на выдатныя палітычныя карыкатуры Алега Карповіча — і шкадую, што сышоў у мінулае часопіс «Вожык». Новыя кнігі выклікаюць у людзей пачуццё павагі да Радзімы, да бацькоў. Жадаю сказаць аўтарам шчыры дзякуй за іх працу. Упэўнены, што ад яе выйграе ўся краіна, увесь наш народ — і кожны з нас.

Адбылася і аўтограф-сесія з аўтарамі кніг палітычнай публіцыстыкі.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# СТРОГА ПА ГРАФІКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

За першае паўгоддзе ў сістэме ЖКГ выкананы работы па выпрабаванні абсталявання амаль 2,5 тысячы кацельняў, 10,6 тысячы кіламетраў цеплавых сетак, прафесіянальны агляд абсталявання 2273 кацельняў і 1026 цэнтральных цеплавых пунктаў. Заменена 180,6 кіламетра цеплавых сетак. Таксама перакладзена 150,8 кіламетра сетак водазабеспячэння і 57,8 кіламетра сетак каналізацыі, адрамантавана 419 артэзіянскіх свідравін. Выкананы прафрэмонт сістэм ацяплення 29 тысяч жылых дамоў, 25 тысяч цеплавых пунктаў. У жылфондзе адрамантавана 225 тысяч пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў і 538 тысяч квадратных метраў дахаў.

Поўная гатоўнасць жыллёва-камунальнай гаспадаркі да работы да маючага адбыцца асенне-зімовага перыяду будзе забяспечана ва ўстаноўленыя тэрміны, перакананая эксперт.

Святлана Цімошкіна адзначыла, што арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі напярэдадні маючага адбыцца асенне-зімовага перыяду рыхтуюць не толькі цеплавую гаспадарку, але і водаправодна-каналізацыйны, а таксама жыллёвы фонд, які знаходзіцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ.

Паводле слоў Святланы Цімошынай, міністэрствам ажыццяўляецца штотыднёвы кантроль па 13 асноўных паказчыках: замена і капрамонт катлоў, замена цеплавых сетак і стварэнне запасаў драўнянага паліва. Таксама праводзіцца прафілактычны рамонт сістэм ацяплення жылых дамоў, цеплавых пунктаў, рамонт стыкаў, дахаў і іншае. У гэты час ажыццяўляецца штомесячны кантроль па больш чым 60 паказчыках: работы па выпрабаванні абсталявання кацельняў цеплавых сетак і прафілактычны рамонт абсталявання кацельняў і цэнтральных цеплавых пунктаў, прафілактычны агляд рамонту водаправодных і каналізацыйных сетак і збудаванняў на іх, рамонт электраабсталявання жылых дамоў і печаў, паверка прыбораў уліку і гэтак далей.

Спецыяліст звярнула ўвагу на тое, што згаданыя мерапрыемствы гарантуюць надзейнае і бесперабойнае цеплаводазабеспячэнне жылога фонду, а таксама забеспячэнне функцыянавання ўсёй інфраструктуры гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў у ацяпляльны перыяд.

## Да пачатку сезона будуць усе пашпарты гатоўнасці

Як адзначыў **першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер «Дзяржэнергагазнагляда» Дзмітрый ЛАСЯНКОЎ,** напярэдадні сезона будзе аформлена каля 30 тысяч пашпартоў гатоўнасці да ацяпляльнага перыяду і амаль 10,3 тысячы пашпартоў гатоўнасці ведамасных цеплакрыніц. Па стане на 15 ліпеня ўжо зарэгістравана 14 % пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і 10 % пашпартоў па цеплакрыніцах.

Калі браць арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, цяпер зарэгістравана ўжо больш за 5 % пашпартоў гатоўнасці спажыўцоў і 17 % па пашпартах гатоўнасці цеплакрыніц. «Мы ідзём наперадзе на некалькі працэнтаў у параўнанні з паказчыкамі мінулага года. Цяпер спецыялісты «Дзяржэнергагазнагляда» абследуюць паднаглядныя аб'екты па падрыхтоўцы да асенне-зімовага перыяду», — дадаў спецыяліст.

Пры абследаванні аб'ектаў ЖКГ асаблівая ўвага аддаецца кантролю за выкананнем работ па тэхнічным абслугоўванні, рамонце, выпрабаваннях абсталявання цеплавых сетак і інжынерных камунікацый. Акрамя таго, ацэньваецца працаздольнасць запорнай і рэгулюючай арматуры абсталявання і трубаправодаў, наяўнасць ізаляцыйнага пакрыцця на трубаправодах і іншым абсталяванні сістэм цеплаcпажывання і гарачага водазабеспячэння.

Асобна праводзіцца работа ў рамках падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду па кантролі за аднаўленнем пашкоджаных кабельных ліній і спажывецкіх кабельных ліній, якія знаходзяцца на балансе суб'ектаў гаспадарання.

## Да форс-мажорных абставін — гатовыя

Энергетыкі да ацяпляльнага сезона замянілі больш за 76 кіламетраў цеплавых сетак. **Першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ДВА «Белэнерга» Уладзімір БАБРОЎ** адзначыў, што аб'екты энергетыкі паспяхова рыхтуюцца да асенне-зімовага перыяду і абавязкова забяспечаць надзейнае электра- і цеплазабеспячэнне спажыўцоў сваёй краіны.

Ён, у прыватнасці, звярнуў увагу на тое, што падведамасныя арганізацыі гатовыя да любога развіцця сітуацыі. Так, завяршаюцца работы па стварэнні запасаў топачнага мазуту; плануецца нарыхтаваць 300 тысяч тон гэтага паліва.

— Сёння ў нашых рэзервуарах захоўваецца больш за 270 тысяч тон мазуту. Ён забяспечвае рэзервовае выкарыстанне паліва ў выпадку якіх-небудзь абмежаванняў альбо сітуацый з прыродным газам, што выкарыстоўваецца як асноўнае паліва. Рэалізоўваецца план па папярэджанні розных надзвычайных сітуацый (пажараў і іншых), які ўключае 51 мерапрыемства. Камісіямі ўжо правераны сістэмы пажарнай аўтаматыкі, дымавыдалення, аб'екты супрацьпажарнага водазабеспячэння, каб усё гэта працавала як мае быць», — сказаў прадстаўнік «Белэнерга».

Работы па падрыхтоўцы да асенне-зімовага перыяду выконваюцца ў адпаведнасці з зацверджанымі графікамі, адзначыў ён. У цэлым па краіне капітальны рамонт павінен прайсці на больш чым 20 энергетычных катлах, 14 турбінах, 6 вадагрэйных і 4 паравых катлах. Таксама рыхтуецца да работы ў перыяд халадоў і электратэхнічнае абсталяванне. Усяго запланаваны капітальны рамонт 20 генератараў, 10 сілавых трансфарматараў, а таксама комплексны рамонт 169 падстанцый напружаннем 35-110 кВ. Работы вядуцца і на лініях электраперадачы — амаль 10 тысяч кіламетраў ЛЭП ужо капітальна адрамантаваная, а гэта 43 % ад гадавога плана.

Да маючага адбыцца асенне-зімовага перыяду сфарміравана 1,4 тысячы падраздзяленняў для выканання аварыйна-аднаўленчых работ агульнай колькасцю больш за 7 тысяч чалавек. Яны ў поўным аб'ёме ўкамплектаваны сродкамі аховы, неабходнымі матэрыяламі і інструментамі. На балансе энергазабеспячальных арганізацый знаходзіцца 186 дызельных электрастанцый. Адпрацаваны парадак дзеяння ў аператыўных груп ва ўмовах узнікнення парушэнняў энергазабеспячэння з-за нізкіх тэмператур. Праводзіцца процiаварыйныя трэніроўкі.

## Газ — прадукт сур'ёзны і зручны

Газазабеспячальныя арганізацыі праверылі тэхнічны стан 388 тысяч адзінак абсталявання напярэдадні ацяпляльнага сезона, расказаў падчас прэс-канферэнцыі **намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Белпалівагаз» Дзмітрый ШАЎЛОЎСКІ.**

На самай справе, штогод «Белпалівагаз» распрацоўвае комплексы мерапрыемстваў і задач, гэтым разам — на 2022—2023 гады, у якім улічаны ўсе пытанні папярэджання ацяпляльнага сезона. «Цяпер ідзе планамерная работа камісіі па кантролі і ўліку мерапрыемстваў, якія выконваюцца, па падрыхтоўцы да ацяпляльнага перыяду. Па рамонце і рэканструкцыі абсталявання газаразмеркавальных сетак і газавыкарыстальнага абсталявання за 6 месяцаў 2022-га праведзены праверкі тэхнічнага стану амаль 400 тысяч адзінак абсталявання», — заўважыў Дзмітрый Шаўлоўскі.

Сёлета таксама праведзена адключэнне газавыкарыстальнага абсталявання з арганізаваным адводам прадуктаў згарання ў 4,4 тысячы кватэр. У 43 % выпадкаў прычына адключэння — парушэнне правілаў карыстання газам у быце, 11 % — адсутнасць акта праверкі тэхнічнага стану і толькі 5 % — няспраўнасць дымавых і вентыляцыйных каналаў.

Па рамонце і замене асноўнага абсталявання на газаразмеркавальнай сістэме ўсе работы выконваюцца ў планавым аб'ёме і праблем не назіраецца, адзначыў спецыяліст. Што датычыцца прадпрыемстваў, якія займаюцца пастаўкай цеплавой энергіі ў пэўных аб'ёмах на населеных пунктах, то па катлах, артэзіянскіх свідравінах, рамонце цеплаабменнікаў, трансфарматараў, ліній электраперадачы, цеплавых камер і цеплавых сетак работы таксама вядуцца ў планавым парадку, ужо выканана 70 % ад запланаванага аб'ёму. Па забеспячэнні тарфяной паліўнай прадукцыі за першае паўгоддзе 2022 года аб'ём вытворчасці тарфяных брыкетаў склаў 394 тысячы тон, што складае 110 % да плана і 111 % да аналагічнага перыяду мінулага года.

Па словах намесніка дырэктара, запланавана вырабіць 1,29 мільёна тон паліўнай прадукцыі, што на 9 % перавышае паказчыкі аналагічнага перыяду мінулага года. «Усе прадпрыемствы «Белпалівагаза» будуць гатовыя да ацяпляльнага сезона 2022—2023 гадоў», — дадаў Дзмітрый Шаўлоўскі.

## Ваду адключаюць на 13 дзён, і не больш

Вернемся да адключэння гарачай вады. Як адзначыла Святлана Цімошкіна, літаральна яшчэ да 2021 года ў нас у краіне тэрміны адключэння гарачай вады складалі 14 дзён. З прыняццем новай рэдакцыі Правілаў цеплазабеспячэння яны скараціліся да 13 дзён. У працэсе падрыхтоўкі дакумента (правілаў) абмяркоўвалася пытанне скарачэння работ да 10 дзён, але не было падтрымана ў тым ліку калегамі камунальнікамі з энергетыкі, улічваючы вялікі аб'ём работ, які неабходна выканаць.

Прадстаўнік Мінжылкамгаса дадала, што працяглaсць адключэння гарачай вады звязаная з тэхналагічным працэсам. Спачатку яе астуджваюць і зліваюць з труб, потым выконваюць неабходныя па рэгламенце работы, а потым зноў напаўняюць трубы і награваюць ваду.

«Адключэнне не залежыць ад кагосьці аднаго. Мы выконваем комплексны падыход: сумяшчаем работы як энергетычных службаў, так і камунальных, якія ажыццяўляюць праверку і настройку свайго абсталявання, што забяспечвае функцыянаванне сістэм ацяплення», — пацвердзіў словы калегі першы намеснік генеральнага дырэктара — галоўны інжынер ДВА «Белэнерга» Уладзімір Бабpоў.

Энергетыкі ў гэты час у тым ліку мяняюць цеплaсеткі, шукаюць найбольш уразлівыя ўчасткі і перакладваюць трубы там, а яшчэ робяць планавую замену старых. Уладзімір Бабpоў расказаў, што падчас адключэння гарачай вады праводзіцца праверка труб на цэласнасць пры дапамозе высокага ціску, потым робіцца праверка ўсіх выкананых работ, запаўненне труб і падключэнне. «У пачатку 2000-х мы і на 21 дзень адключалі, і на месяц», — нагадаў спецыяліст.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЁСЦЬ ЗАЖЫНКІ — БУДУЦЬ І ДАЖЫНКІ!

**На полі сельгаспрадпрыемства «Мазалавагаз» прайшоў абласны абрад «Зажынкі», які даў афіцыйны старт уборачнай кампаніі на Віцебшчыне.**

На пасяджэнні аблвыканкама напярэдадні свята першага снапа абмеркавалі актуальныя пытанні ўборкі ўраджаю-2022. Кіраўнік вобласці Аляксандр Субоцін адзначыў, што аграрыям паўночнага рэгіёна трэба ўбраць 367,2 тысячы гектараў збожжавых і зернебабовых культур, крыжакветных — 72,8 тысячы гектараў. Пры добрых умовах надвор'я тэхнічныя магчымасці дазваляюць убраць збожжавыя за 22 дні, крыжакветныя — за 9. Каб сабраць золата палёў, у рэгіёне задзейнічана 1160 камбайнаў. Пакуль што іх гатоўнасць складае 97 працэнтаў, але ўжо на наступным тыдні, калі пачнецца масавае жніво, гэты паказчык павінен быць 100-працэнтным. Асаблівая ўвага — дысцыпліне на кожным этапе ўборкі, пачынаючы ад гарачага харчавання аграрыяў да ўмоў захоўвання зерня.

На залацістым полі СГП «Мазалавагаз» УП «Віцебскаблгаз»



Фота БелТА

жней паднеслі гасцям — старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзіміру Андрэйчанку, старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандру Субоціну, яго намесніку Барысу Яфрэмаву — першыя снапы з новага ўраджаю. «Сёлета ў нас усё павінна атрымацца. З Богам і наперад!» — пажадаў работнікам АПК Аляксандр Субоцін. Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў значнасць харчовай бяспекі краіны ва ўмовах санкцый з боку калектыўнага Захаду і выказаў упэўненасць, што хлебаробы змогуць сабраць і зберагчы ўраджай, а значыць, накарміць народ Беларусі.

Протаіерэй Андрэй Смольскі блаславіў аграрыяў на высакародную працу і асвяціў тэхніку. Каб яшчэ раз напомніць аб важнасці і адказнасці сёлетняй уборачнай кампаніі, старшыня аблвыканкама ўручыў кіраўнікам рай- і гарвыканкамаў, аграпрамысловых прадпрыемстваў майкі з цытатай Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі «Распранайся і працуй». Гэта не проста словы, а прамая інструкцыя да дзеяння, бо толькі адзіным фронтам можна ў аптымальна кароткі тэрмін убраць ураджай і захаваць устойлівасць харчовага суверэнітэту.

У гэты дзень свята першага снапа прайшло і ў Віцебскім раёне на полі СУП «Ліпаўцы». Пад абрадавыя песні Капцянскага Дома культуры і шчырыя віншаванні на 25-гектарным полі азімага трыцікале зжалі першы сноп. Першыя камбайны тут выйшлі на палі яшчэ 22 ліпеня, і ўраджай ужо паказаў добрыя вынікі — больш за 35 цэнтнераў на круг. За тыдзень у «Ліпаўцах» ужо намалочана больш за 400 тон зерня. Старшыня Віцебскага райвыканкама Генадзь Сабыніч пажадаў хлебаробам добрага надвор'я, беспярэбойнай работы тэхнікі, ударнага настрою і моцнага здароўя на ўборачную, якое можна зберагчы толькі пры захаванні тэхнікі бяспекі.

«100 дзён таму ў прадпрыемстве мы праводзілі абрад «Засеўкі», а сёння ўжо бачым вынік нашай агульнай і карпатлівай работы — поле, як залатая роўная сцэна. Гэта радуе вока, і аграрыі з энтузіязмам і адданасцю выходзяць на палі», — адзначыў дырэктар СУП «Ліпаўцы» Уладзімір Булай.

Галоўнай формулай працоўных поспехаў з'яўляецца падтрымка аграрыяў на ўсіх этапах жніва, як маральная, так і матэрыяльная. Напярэдадні ўборачнай кампаніі райкам прафсаюза работнікаў АПК запусціў акцыю «Прафсаюзы — аграрыям», у межах якой для механізатараў было закуплена па пяць тэрмасумак на кожную гаспадарку. Гэтыя каштоўныя падарункі працаўнікам падчас «Зажынак» уручыла старшыня раённай галіновай прафсаюзнай арганізацыі Таццяна Дзіканава, пажадаўшы поспехаў на хлебнай ніве.

Галоўнымі героямі свята сталі механізатары і кіроўцы, занятыя на адвозцы. А гул матораў жалезных караблёў, ператтвараючых важкі колас у зерне, стаў фінальным акордам мерапрыемства.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ — НАДВОР'Е Ў ПОЛІ

## Папрацаваць і зарабіць

Ачыстка, прадзіманне, запраўка, наладка... Рытм напоўненай справамі раніцы ў гаспадарцы ААТ «Уцеўскае» ўпэўнены, дакладны. Работнікі засяроджаныя і ўважлівыя. Камбайнеры і іх памочнікі рыхтуюць свае машыны да выхаду на лінію: правяраюць рабочыя вузлы і сістэму ахаладжэння. Пасля перад рэйсам абавязкова пераапрануцца ў спецвопратку і абутак — у кабіну, за штурвал, вядома, як у рабочы кабінет. У ім, вельмі спадзяюцца байцы жніва, правядзеш і 12 гадзін, з перапынкам толькі на абед. Зразумела, вельмі хочацца як след пастарацца: як мае быць, папрацаваць і зарабіць.

Пасля праліўных дажджоў, якія моцна марудзілі ўборачную ў гаспадарках Гомельшчыны на самым старце, вымушалі няспынна вырываць у прыроды «вокны надвор'я», работнікі «Уцеўскага», як і ўсе, імкнуцца ўзяць рэванш. У апошнія дні з-за багатай расы камбайны выязджаюць на свае «квадраты» каля дзесяці раніцы. Працаваць даводзіцца і да адзінаццаці вечара.

— Добра, вядома, калі можна без перапынку адпрацаваць вялікі ўчастак. Кароткі перапынак на абед — і зноў за работу. Увечары, калі сцямнее, з уключанымі ліхтарамі працуеш, як днём, — тлумачыць **камбайнер Уладзімір АСАДЧЫ.**

За штурвалам камбайна ён амаль тры дзясяткі гадоў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У поле сёлета выходзіць на самай новай пакуль у гаспадарцы машыне, якой тры гады. Хутка камусьці з байцоў жніва пашчасціць перасесці за руль новенькага КЗС1218 — чакаюць «губернатарскі» падарунак у гаспадарцы з нецярпеннем. Пакуль нагрузка на камбайны дастаткова высокая.

## Правілы жніва

На жорсткім кантролі тэхпадтрымка: закуплены ўсе неабходныя запчасткі і вузлы на выпадак паломак. Максімальная ўвага і да пажарнай бяспекі падчас работы тэхнікі на палях.

— Трактар з прычэпамцыстэрнай з вадой суправаджае камбайн на працягу ўсёй змены. Дадатковая ёмістасць з вадой ёсць і на самім кузаве камбайна, — адзначае **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Уцеўскае» Уладзімір ХАЛЯЎКІН.** — Вялікая ўвага і ўмовам працы работнікаў. Трохразовым харчаваннем забяспечваем не толькі механізатараў і кіроўцаў, але і ўсіх работнікаў, якія задзейнічаны на таку. Абавязкова штодня забяспечваем і пітвом — астуджаныя бутэлькі з мінеральнай вадой выдаём перад зменай.

Цяпер падчас жніва адчуваецца, як «уцеўцы» імкнуцца вытрымліваць і важнае жыццёвае правіла: у гарачую пару — ніякіх залішне эмацыянальных выхадак, не трывожыць адно аднаго, трымацца дружна, зладжана, бы рабочая сям'я з больш як 150 чалавек. І сапраўды, у гаспадарцы многія працуюць сем'ямі, з пакалення ў пакаленне застаюцца працаваць у роднай гаспадарцы. Гонар калектыву — сямейная дынастыя Марфушкіных. Суперадказнасць, выдатная працаздольнасць і ўнікальнае адчуванне любой сельгастэхнікі — усё гэта пра трактарыстаў-машыністаў — бацьку вялікага сямейства Аляксандра Марфушкіна, яго чатырох сыноў і роднага брата Юрыя Марфушкіна.

крыху больш за паўтары тысячы гектараў збожжавых. Без уліку кукурузы плануем намалаціць чатыры з паловай тысячы тон, каб выйсці на ўзровень не ніжэйшы за леташні. Ужо цалкам прыбралі азімы рапс — 77 гектараў у нас пад яго было адведзена. Выканалі па дадзенай культуры план



**Трактарыст-машыніст ААТ «Уцеўскае» Аляксандр МАРФУШКІН працуе ў гаспадарцы 40 гадоў. Падрыхтаваў да работы і сваіх пераемнікаў — чатырох сыноў.**

— З 12 гадоў дапамагаў бацьку на машынах, таму з дзяцінства ўсё ў мяне звязана з тэхнікай. У гаспадарку працаваць прыйшоў адразу пасля школы, — коратка расказвае пра сябе малодшы з дынастыі аграрыяў Пётр Марфушкін: ёсць пара хвілін, каб пераапрануцца, і зноў выходзіць на лінію.

## Няспынны рытм

Чакаюць, калі свае ўчасткі адпрацуюць камбайнеры, у гэты час не толькі кіроўцы, што задзейнічаныя на адвозцы збожжа, але і механізатары, якія працуюць на прэсе. Прыбраць сухую салому пасля жніва своечасова — не менш важна. Не даюць перапынку на жніво і нарыхтоўка сена ў плёнку, падрыхтоўка глебы для сяўбы рапсу.

— Наогул цяпер адна з вострых задач — убраць дзяржзаказу, — па дарозе на поле ўводзіць у курс справы **намеснік дырэктара па раслінаводстве ААТ «Уцеўскае» Галіна ДЗЯМКОВА.**

Кажа, парадаваў ураджай нядаўна ўбранага азімага рапсу — амаль 22 цэнтнеры з гектара.

— Гэта значна вышэй, чым у сярэднім па раёне. Цяпер актыўна прыбіраем жыта, таму што мы яго звычайна сеем самым першым, яно першым і спее. Потым пачнём уборку пшаніцы. Пад гэтую культуру ў нас адведзена 450 гектараў. Моцная наша гаспадарка традыцыйна кукурузай. Засеяна каля 2300 гектараў. Крыху менш за 200 гектараў — прыбяром на збожжа. Ураджайнасць яе летась была на ўзроўні 70 % на круг, а намалот збожжа кукурузы склаў каля паўтары тысячы тон, — дакладна і без папер выдае па памяці Галіна Васілеўна. Сама за рулём, на заднім сядзенні «Нівы» шмат дзіцячых цацак.

— Шэсць гадоў таму прыехала ў гаспадарку, змяніла работу ў горадзе ў сельгасупраўленні, — дзеліцца яна. — А цацкі сынавы. Яму пяць. З дзіцячага садка забіраю, і мы з ім да ночы з поля на зярняток. Мае дома ўжо назвы ўсіх урочышчаў, дзе сеемся-ўбіраемся, ведаюць. І дачку старэйшую часта бяру з сабой на работу.

Можа, так у сям'і Галіны Дзямковай і нараджаецца чарговая працоўная дынастыя аграрыяў, што праславіць ААТ «Уцеўскае» і свой раён.

## Проста аб галоўным

Працаўнікі ў аддаленым куточку Добрушскага краю ў гэтыя самыя дні чарговы раз адчулі: пра іх нялёгкую барацьбу за ўраджай, за харчовую бяспеку гавораць на самым высокім узроўні, падтрымліваюць, перажываюць за найважнейшую агульнанацыянальную задачу.

Яны павінны быць галоўнымі героямі на старонках друку, у тэлеэфіры і інтэрнэце, акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас селектарнай нарады па пытаннях уборачнай кампаніі. Сваёй суразмоўніцы — намесніку дырэктара па раслінаводстве ААТ «Уцеўскае» Добрушскага раёна Галіне Дзямковай адрасую пытанне: што важнага працаўнікі вёскі адкрылі для сябе ў словах Прэзідэнта?

— Адчуваецца моцная падтрымка нас, простых людзей на зямлі. Пасля выступлення Прэзідэнта мы ў сваім калектыве абмеркавалі, якія задачы стаяць перад намі, — падзялілася Галіна Дзямкова. — Мяне як прадстаўніка аграноміі вельмі зацікавіла агучанае пытанне па рэгуляванні структуры сельскагаспадарчых земляў, вызначэнні прыярытэтных культур для культывавання на той ці іншай тэрыторыі. Зацікавілі і прапановы ад кіраўніцтва нашага рэгіёна аб пашырэнні азімага палетка, магчымым змяненні структуры пасяўных плошчаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

### У тэму

На Гомельшчыне сёлета павялічаць плошчы азімых ячменю і рапсу. На ключавыя задачы пасяўной кампаніі бягучага года акцэнтаваў увагу **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО** на пасяджэнні з удзелам **намесніка прэм'ер-міністра Юрыя НАЗАРАВА.** Як адзначыў губернатар, пытанне аб севазвароце ў рэгіёне сёння прапрацавана, у тым ліку з вучонымі. Прапрацаваны нюансы пастаўкі элітнага насення азімага ячменю і рапсу, плошчы якіх у паўднёва-ўсходнім рэгіёне маюць намер сур'ёзна павялічыць. Вызначаны крыніцы фінансавання па ўгнаеннях.

